# Жанры лірыкі. Класічныя формы верша

***Элегія*** — верш-роздум, у якім выяўляецца настрой смутку, журбы, меланхоліі.

***Ода*** — урачысты, узнёслы верш у гонар нейкай з'явы, падзеі ці асобы.

***Раманс*** — невялікі верш напеўнага характару пра каханне.

***Санет*** — верш з 14 радкоў, напісаных ямбам.

Калі вы знаёміліся з канкрэтнымі творамі, то заўважылі, што існуе пэўная заканамернасць паміж тым, пра што расказвае твор, і яго мастацкімі асаблівасцямі. Змест і форма ў вершы ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Паводле зместу і формы лірыка дзеліцца на шматлікія жанры, якія змяняюцца з часам, набываюць або губляюць сваю актуальнасць і папулярнасць. Некаторыя з жанраў лірыкі вам ужо вядомыя. Так, да жанру элегіі (верша, прасякнутага сумам) адносіцца твор «Бывай» Аркадзя Куляшова. Многія вершы пра Радзіму, беларускі народ, з якімі вы пазнаёміліся, маюць жанравую адзнаку оды, урачыстага, услаўляльнага верша («Беларуская песня» Уладзіміра Караткевіча, «Зямля Беларусі» Петруся Броўкі, «Продкі» Алеся Пісьмянкова). З песенных жанраў вам вядомы «Раманс» Максіма Багдановіча.

Жанры лірыкі склаліся вельмі даўно, яшчэ ў старажытнасці, таму нават назвы іх па паходжанні пераважна грэчаскія. Большасць класічных жанраў лірыкі сёння ў чыстым выглядзе не сустракаецца. Можна гаварыць толькі пра іх асобныя рысы ў лірычным вершы. Межы паміж жанрамі лірыкі даволі ўмоўныя, у адным вершы могуць спалучацца розныя жанравыя прыметы. Так, у вершах «Бывай» Аркадзя Куляшова і «Раманс» Максіма Багдановіча спалучаюцца рысы элегіі і песні, раманса.

Адметным жанрам лірыкі з'яўляецца ***санет***, які ўзнік у XIII стагоддзі і першапачаткова выкарыстоўваўся для ўвасаблення тэмы кахання. Пазней з'явіліся санеты на іншыя тэмы, пераважна філасофскія. Аднак істотная адметнасць санета не ў яго змесце, а ў кампазіцыі: у гэтым вершы абавязкова чатырнаццаць напісаных



Правообладатель Национальный институт образования

ямбам радкоў, якія дзеляцца на дзве часткі. У першых васьмі радках падаецца развіццё тэмы, у наступных — кульмінацыя і развязка, падагульненне. Санет вызначаецца дакладнымі патрабаваннямі і да рыфмоўкі радкоў. Калі абазначыць аднолькавыя рыфмы аднолькавымі літарамі, то атрымаецца формула-рыфмаграма. Для класічнага санета яна наступная: *абба абба ввг дгд*. Асаблівая сэнсавая нагрузка падае на апошняе слова верша. Як бачым, патрабаванні да формы твора вельмі строгія. Таму санет адносіцца да ***класічных (цвёрдых) форм верша***.

Цвёрдых страфічных форм у паэзіі вельмі многа. Акрамя санета, часта выкарыстоўваюцца трыялет і актава. Для іх характэрны дакладна вызначаная колькасць радкоў у вершы, пэўная сістэма рыфмоўкі і адметная для кожнай формы верша кампазіцыя.

***Трыялет*** — васьмірадковы верш, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радок аднолькавыя. Адзін радок паўтараецца тройчы (адсюль і назва) і завастрае ўвагу чытача на асноўнай думцы твора. Рыфмаграма трыялета можа мець варыянты: *аббабааб* ці *аббаабаб*.

***Актава*** — таксама васьміраДковы верш, шэсць першых радкоў у якім звязаны перакрыжаванай рыфмоўкай, а два апошнія — сумежнай, што акцэнтуе думку-падагульненне, прыцягвае ўвагу да ідэі твора. Рыфмаграма актавы: *абабабвв*.

Класічныя формы верша існуюць на працягу многіх стагоддзяў ва ўсіх еўрапейскіх літаратурах і заключаюць у сабе законы прыгажосці і гармоніі. Таму яны актыўна ўжываюцца і ў сучаснай лірыцы.

Чым вызначаецца кампазіцыя санета?

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

# Санет

Замёрзла ноччу шпаркая крыніца;
Твая пара, зімовая нуда!
Цяпер няма ўжо руху ні сляда,
І нават зверху слоем снег лажыцца.


Правообладатель Национальный институт образования

Ды ўсё дармо, бо там, пад ім, струіцца
Магутная, жывучая вада.
Чакай! Яе йшчэ прыйдзе чарада!
Здалее хваляў хор на вольны свет прабіцца.

Прыклаў я гэты сімвал да сябе,
Схіліўшыся ў надсільнай барацьбе,
І разгадаў прыроды роднай словы.

Як — прамаўчу, бо кожны з вас — паэт.
Рассейце ж самі лёгкі змрок прамовы,
Сваёй душы туды праліце свет!

1. Згадзіўшыся са словамі М. Багдановіча пра тое, што кожны з нас — паэт, паспрабуем разгадаць загадку *«шпаркай крыніцы»*. Перачытайце першую частку верша і падумайце, як мог узнікнуць гэты вобраз.
2. У першай частцы «Санета» паэт развівае тэму *«шпаркай крыніцы»*, у другой — прапануе кожнаму прыкласці гэты сімвал да сябе і зрабіць вывад. Які ён атрымаўся ў вас?
3. Дакажыце на аснове радкоў з твора, што яго лірычны герой, нягледзячы на тое што жыццёвы лёс яго складваўся няпроста, з аптымізмам ставіцца да жыцця.
4. Вызначце колькасць радкоў у творы і асаблівасці яго кампазіцыі.
5. Якім вершаваным памерам напісаны верш?
6. Успомніце, што такое рыфма. Вызначце, якія радкі рыфмуюцца ў першай частцы верша, якія — у другой. Абазначце аднолькавыя сугучны аднолькавымі літарамі і запішыце своеасаблівую формулу-рыфмаграму верша.
7. Ці адпавядае верш М. Багдановіча патрабаванням зместу і формы санета?
8. Прачытайце санет англійскага драматурга і паэта Уільяма Шэкспіра «Мастак цудоўны, незраўнаны час...» у перакладзе Уладзіміра Дубоўкі і параўнайце яго з санетам Максіма Багдановіча «Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...» па наступнай схеме:
   а) асноўная думка твора;
   б) падзел яго на часткі;
   в) вершаваны памер;
   г) сістэма рыфмоўкі.

   Чым адрозніваюцца рыфмаграмы санетаў Максіма Багдановіча і Уільяма Шэкспіра?


Правообладатель Национальный институт образования

Санет (ад італ. слова *звінець* ці праванс. — *песенька*) — вельмі папулярная ў сусветнай літаратуры класічная форма верша. Па страфічнай будове адрозніваюцца італьянскі санет, у якім ёсць 2 чатырохрадкоўі і 2 трохрадкоўі, і англійскі санет, у якім 3 чатырохрадкоўі і двухрадкоўе. Агульная колькасць радкоў усё роўна 14. Паэты прыдумалі такую складаную, але распаўсюджаную форму, як вянок санетаў з 15 твораў, у якім кожны апошні радок санета становіцца першым радком наступнага, а апошні радок чатырнаццатага санета з'яўляецца адначасова першым радком першага санета. Апошні, пятнаццаты, санет утвораны з першых радкоў усіх папярэдніх санетаў. А беларускі паэт Змітрок Марозаў прыдумаў унікальную ў сусветнай літаратуры форму — вянок вянкоў санетаў!

## АНАТОЛЬ ГРАЧАНІКАЎ

### 1938—1991



Усе вершы А. Грачанікава, як правіла, вельмі асабістыя: у кожным прысутнічае сам паэт са сваімі адчуваннямі, думкамі і пачуццямі. Аднак яго «я» паўстае не вонкава — яно арганічна сплаўляецца з радком, з кожнай яго клеткай, выступаючы, як голас самога жыцця.

*У. Гніламёдаў.*

* * *

Свяці, кахання чыстая зара!
Свяці — пачуццяў сэрцаў не азмрочвай —
Над доляй плугара і песняра
І над высокай доляю жаночай.
Усіх людзей пара табе, пара,
З'яднаць чароўнай сілаю прарочай.
Бо, сапраўды, на свеце без кахання
Жыцця няма — ёсць толькі існаванне.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Выберыце словы, якія найлепш вызначаюць інтанацыю гэтага верша: пяшчотная, узвышаная, іранічная, нейтральная. Прапануйце свае варыянты.
2. Раскрыйце сэнс ужытай у першым радку твора метафары. У якіх яшчэ вядомых вам вершах каханне звязвалася з вобразамі зоркі, заранкі?
3. У вершы арганічна спалучаюцца філасофскія і інтымныя матывы. Прачытайце радкі, у якіх сфармулявана галоўная думка твора. Чаму аўтар ужывае слова «сапраўды»? Да каго яно звернута?
4. Вызначце асаблівасці рыфмоўкі радкоў у творы.
5. Дакажыце, што верш Анатоля Грачанікава «Свяці, кахання чыстая зара!..» — гэта актава. Чаму гэта класічная форма верша мае назву, якая супадае з музычным тэрмінам?

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

## Трыялет

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.
Няхай усе з мяне рагочуць.
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.

1. Так сапраўды бывае: глянеш на сонца — і на нейкі час у вачах становіцца цёмна. Але праз імгненне яшчэ ярчэй відаць тое, што вакол. Чаму паэт звярнуўся да такой з'явы?
2. Што мае на ўвазе аўтар, калі гаворыць пра сонца і *«цемень вечнай ночы»*? Што перамагае ў супрацьстаянні?
3. Некаторыя радкі гэтага верша паўтараюцца, несучы іншы настрой і падтэкст. Назавіце іх.
4. Ці адпавядае верш Максіма Багдановіча класічнай кампазіцыі трыялета? Дакажыце сваю думку.


Правообладатель Национальный институт образования